# Яшчэ раз пра кантроль і ацэнку на ўроку

## Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка: праблемы і шляхі вырашэння

**Николай Иванович ЗАПРУДСКИЙ,**
профессор кафедры педагогики
и менеджмента образования АПО

Пра кантрольна-ацэначную дзейнасць настаўніка і вучняў напісана шмат. Тэма вельмі шырокая, шматаспектная. Яна застаецца надзвычай актуальнай, бо многія школьныя праблемы абумоўлены няўмелым прымяненнем настаўнікамі інструментаў уздзеяння на вучняў і іх навучанне. У невялікім артыкуле немагчыма грунтоўна разгледзець гэтае пытанне, таму засяродзімся на трох тэзісах:

***1. Памылкі ў вучнёўскіх работах павінны выпраўляць не настаўнікі, а самі вучні.***

Думаю, вы бачылі такую сітуацыю: настаўнік раздаў вучням сшыткі з праверанымі работамі. Яны іх разгарнулі, паглядзелі на адзнакі і адразу загарнулі. На настаўніцкія выпраўленні яны нават не зірнулі.

Іншая сітуацыя: настаўнік убачыў памылкі / недахопы, падкрэсліў іх і ніжэй запісаў:

- у чым работа добрая (заўсёды можна знайсці, за што пахваліць);
- што не адпавядае крытэрыям, нормам, узорам, правапісу і інш.;
- як памылкі выправіць (парады, да якога правіла звярнуцца, дзе паглядзець узор і г. д.);
- як вучыцца далей, каб быць паспяховым.

Важнае назіранне: выпраўленне памылак настаўнікам не застаецца ў памяці і не дае гарантыі, што вучань іх не будзе паўтараць у будучыні. Калі вучань сам выпраўляе сваю памылку, то верагоднасць яе паўтарэння істотна зніжаецца.

Разумею, што ў чытача ўзнікаюць як мінімум два пярэчанні:

1) Дзе настаўніку знайсці час, каб кожнаму вучню напісаць каментар на яго работу: «У мяне 75 вучняў на паралелі! За праверку сшыткаў плацяць мізер!». А хто сказаў, што трэба пісаць усім? Пішыце тым вучням, якія ў гэтым маюць найбольшую патрэбу. Калегі, вы не знойдзеце лепшага спосабу вярнуць у адукацыйны працэс вучня, які «адбіўся ад рук», нічога не жадае рабіць. Ваш асабісты зварот, у якім вы адзначыце, у чым ён паспяховы, што і як палепшыць, для вучня настолькі важны, што, як адзначаюць паспяховыя настаўнікі, ён змяняе ў лепшы бок сваё стаўленне да навучання. Добра, калі гэта робіць не адзін настаўнік паралелі, а некалькі ці ўсе педагогі.

2) Настаўнік не можа пісаць каментары, бо гэта забараняюць нарматывы. Сапраўды, у сшытках для кантрольных работ пісаць нельга, там робім выпраўленні і выстаўляем адзнакі. Але ж у вучняў ёсць рабочыя сшыткі, ці яны выконваюць заданні, практыкаванні на аркушах.

***2. Могуць і павінны быць урокі без адзнак, але не можа быць урокаў без ацэнак.***

Нагадаем, што ацэнка — гэта меркаванне аб каштоўнасці, якасці чаго-небудзь, напрыклад ведаў вучня. Адзнака — бальнае выражэнне ацэнкі. У першым і другім класах адзнак няма, але ёсць ацэнкі.

Зноў канкрэтная сітуацыя. На ўроку настаўнік праводзіў франтальнае апытанне. Вучань Сяргей, які звычайна атрымлівае на ўроках дзевяць ці дзесяць, сёння атрымаў сем. Напрыканцы ўрока педагог выстаўляе адзнакі і каментуе іх: «Сяргей, сёння ты быў актыўны, але двойчы памыліўся, стаўлю табе сем балаў». Вы, вядома ж, здагадаліся, пра што ў гэты момант падумаў Сяргей: «Навошта я вытыркаўся, не паднімаў бы руку, не было б гэтай сямёркі».

Вучні, калі ведаюць, што яны ўвесь час пад пры-

**ЧИТАЙТЕ В СВЕЖЕМ НОМЕРЕ «ОМ»**